# АТРЫМАЛІ ПЕРШАЕ ПРАЦОЎНАЕ МЕСЦА









Для студэнтаў-выпускнікоў надышоў самы адказны і хвалюючы момант – размеркаванне. Сёлета накіраванні на сваё першае месца працы атрымалі 385 студэнтаў дзённай формы навучання і 8 – завочнай. На ўсіх факультэтах размеркаванне прайшло паспяхова, практычна кожны студэнт ужо загадзя ведаў, дзе ён будзе адпрацоўваць два гады. Хтосьці знайшоў працу самастойна і прынёс імянны запыт, а камусьці працоўнае месца прапанавала камісія па размеркаванні. Таму ўсе студэнты ўпэўнена заходзілі ў аўдыторыю, бо ведалі: для іх месца працы знойдзена. Так было і на філалагічным факультэце, на якім пабывала наша рэдакцыя.

Канешне, нас найперш цікавіла размеркаванне студэнтаў спецыяльнасці «Беларуская філалогія», паколькі некаторыя з іх цесна супрацоўнічаюць з нашай газетай яшчэ з першага курса. Гэта Ганна Ціхачова, Андрэй Шчарбіцкі, Юлія Гаўрыленка, а таксама Таццяна Васільева, Дзіяна Лось, Вераніка Радзько, Настасся Чартарыжская, Марына Драняева, Вераніка Шыпіла і інш. На жаль, не ўсе яны будуць працаваць у рэдакцыях газет, але спадзяёмся, што той вопыт, тыя практычныя навыкі і ўменні, якія яны набылі ў нашай рэдакцыі, спатрэбяцца ім у самастойным жыцці.

Вельмі радасна, што армію журналістаў папоўняць Андрэй Шчарбіцкі (рэдакцыя гарадской газеты «Віцьбічы»), Юля Гаўрыленка (рэдакцыя газеты Віцебскага раёна «Жыццё Прыдзвіння») і Вераніка Радзько (рэдакцыя газеты Лёзненскага раёна «Сцяг Перамогі»).

Мы верым, што, як бы ні склалася іх жыццё, дзе б ім ні прыйшлося працаваць і чым займацца, яны ніколі не забудуць універсітэт, у якім, як імгненне, праляцелі пяць год вучобы, а таксама нашу рэдакцыю, дзе хлопцы і дзяўчаты рабілі першыя творчыя крокі.

У добры шлях, выпускнікі!

**Фота і тэкст Алесі ДУБРОЎСКАЙ.**

**На здымку:** студэнты ФлФ падчас размеркавання.